# Журналістыка

*Т. У. ПАДАЛЯК*

## ДА ПРАБЛЕМЫ ПРАФЕСІЙНАГА СТАНАЎЛЕННЯ І ДУХОЎНАГА СТАЛЕННЯ ЖУРНАЛІСТА

У наш складаны, бурлівы час роля сродкаў масавай інфармацыі (СМІ) у жыцці грамадства нязменна ўзрастае. Усё большую грамадскую актуальнасць набывае праблема адэкватнасці прадмета адлюстравання (рэчаіснасці) ствараемаму журналістамі публіцыстычнаму вобразу. Сярод шэрагу аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў, якія аказваюць непасрэдны ўплыў на гэты працэс, важнае месца займае асоба самога журналіста. Слушным уяўляецца меркаванне даследчыка Ю. Шапавала наконт таго, што асобу любога чалавека нельга разглядаць адарвана ад характару працоўнай дзейнасці, паколькі, з аднаго боку, прафесія патрабуе ад чалавека пэўных якасцей, а з другога — фарміруе неабходныя рысы. «Дзейнасць таленавітага журналіста немагчыма без індывідуальнага стылю, які, у сваю чаргу, з'яўляецца праяўленнем непаўторнасці асобаснага мыслення — адной з галоўных якасцей, неабходных журналісту»[1].

Журналістыка, як і ўсялякая іншая прафесія, уключае і агульныя, і спецыфічныя, уласцівыя толькі гэтаму віду дзейнасці якасці. Апошняе асабліва акрэслена праяўляецца ў творчасці, якая знаходзіцца на стыку навуковага і мастацкага метадаў пазнання рэчаіснасці. Сама спецыфіка прафесіі прадвызначае наяўнасць у работнікаў СМІ высокай духоўнасці (як свядомай, асэнсаванай маральнасці асобы) — каб нават пры імгненным, спантанным поглядзе на незнаёмыя з'явы, падзеі, прадметы сутнасна, з высокай ступенню аб'ектыўнасці і праўдзівасці, без «ператрымак» адлюстроўваць іх у публіцыстычным творы. Вось чаму надзвычай важна, каб паралельна з развіццём прафесійных навыкаў адбывалася і духоўнае станаўленне і сталенне журналіста. На наш погляд, працэс гэты пачынаецца ўжо з першых крокаў у прафесію, са спасціжэння «азоў» журналістыкі і з'яўляецца найбольш плённым і эфектыўным у тым выпадку, калі навучанне журналістыцы ідзе непасрэдна з дапамогаю прафесійных, творчых сродкаў. У сувязі з гэтым на парадак дня ставіцца пытанне ўдасканалення формаў і метадаў падрыхтоўкі духоўна багатай асобы журналіста. Маецца на ўвазе падрыхтоўка прафесіянала, які б не толькі дасканала валодаў эмпірычнымі метадамі пазнання рэчаіснасці, трывала засвоіў асноўныя прыёмы журналісцкага даследавання, жанры журналістыкі, але разам з тым меў бы ўстойлівыя светапоглядныя ўстаноўкі, заснаваныя на гуманістычных каштоўнасцях і ідэалах, развітае пачуццё маральнай і сацыяльнай адказнасці за сваю дзейнасць. Не адмаўляючы традыцыйных, акадэмічных формаў навучання — лекцый, лабараторных, практычных, семінарскіх заняткаў, гістарычна выпрабаваных на выкладанні фундаментальных навуковых ведаў, — мы лічым, што наспела неабходнасць перагляду прынцыпаў выкладання дысцыплін чыста прафесійнага накірунку, набліжэння працэсу навучання да абставін, блізкіх да будучых, вытворчых. Асаблівае значэнне ў сувязі з гэтым набываюць так званыя дзелавыя гульні. Іх мэта — прывіць студэнтам-журналістам прафесіныя прыёмы назірання і навыкі зносінаў

з людзьмі, выпрацаваць уменне даказваць і дакладна аргументаваць свае думкі, нестандартна падыходзіць да разгляду людзей і падзей, імкнуцца за знешнім бачыць існае, сутнаснае. Дзелавыя гульні садзейнічаюць развіццю журналісцкай творчасці, фарміраванню неардынарна мыслячых спецыялістаў, даюць магчымасць кожнаму студэнту ў поўнай ступені праявіць і развіць індывідуальнасць, не збіцца на штамп. Размова ў дадзеным выпадку ідзе не толькі і не столькі аб стылістычных «красотах». Як адзначае даследчык К. Рошчын, «моўныя штампы нараджаюць негатыўную рэакцыю да інфармацыі ў цэлым... Заштампаванасць аднаго інфармацыйнага эпізода можа стварыць негатыўную ўстаноўку на ўспрыняцце ўсяго патоку інфармацыі ад дадзенай крыніцы»[2]. А што да азначэння паняцця «штамп», дык «гэта выражаны ў літаратурнай форме схематызм думкі. Корань заганнасці такой літаратурнай формы — у павярхоўнасці, неканкрэтнасці зместу. Штамп ёсць мысленне гатовымі фразамі»[3]. Вось чаму так важна навучыць журналіста-пачаткоўца пазбягаць штампаў. Ён павінен умець ясна фармуляваць сутнасць праблемы, выяўляць унутраную сувязь падзей і пераконваць чытача не мудрагелістасцю метафар і эпітэтаў, а дакладным падборам доказаў, логікай выкладання матэрыялу.

Ці можна навучыць чалавека творчасці наогул і журналісцкаму майстэрству ў прыватнасці? У дадзеным выпадку важнае значэнне маюць асабістыя схільнасці, наяўнасць калі не таленту, дык абавязкова пэўных здольнасцей, задаткаў, якія неабходна развіваць, «ставіць» з аматарскага ўзроўню на прафесійны.

Як жа вучыць журналісцкаму майстэрству, каб навучанне мела рэальны плён? Перш за ўсё, безумоўна, праз практыку, пастаяннае павышэнне творчай кваліфікацыі студэнта-журфакаўца. Другое: у журналісцкім асяроддзі папулярны афарызм — «добра піша той, хто добра думае». Добра думаць — значыць, мысліць шырока, небанальна, імкнучыся адыходзіць ад стэрэатыпаў і браць пад сумненне агульнапрынятыя меркаванні. Мысліцельныя здольнасці, прафесійную кампетэнтнасць неабходна развіваць і паглыбляць сістэмнай трэніроўкай. Дзелавыя гульні, як нам уяўляецца, дапамагаюць злавіць двух «зайцоў» у рашэнні гэтай задачы: развіваюць асобаснае мысленне студэнтаў і прывучаюць лагічна, стройна і пераканаўча выкладаць свае думкі на паперы.

Адна з умоў паспяховага авалодання журналісцкай прафесіяй — ажыццяўленне прынцыпу «ні дня без радка». Садзейнічаюць гэтаму, прывіваюць смак да сістэматычнага звароту да пяра, напрыклад, у працэсе выкладання курса «Тэорыя і методыка журналісцкай творчасці» не толькі практычныя заняткі, але і лекцыйныя цыклы. На кожным занятку ў форме «гульні» студэнтам прапануецца на працягу 10—15 хвілін выконваць творчыя экспромты на розныя тэмы. Напачатку даюцца заданні нескладаныя (апісанне канкрэтных рэчаў, прадметаў, з'яў), паступова ідзе ўскладненне ад простага, канкрэтнага — да абстрактнага (знайсці варыянт выхаду з праблемы, вырашыць нейкую дылему і г. д.). Напрыклад, апісаць звычайную цыбуліну. Асабістыя ўяўленні студэнтаў раскрываюцца і перадаюцца, натуральна, па-рознаму: адзін апіша знешні выгляд цыбуліны, другі раскажа аб ёй як аб каштоўным прадукце харчавання, трэці ўзгадае «цыбульныя» слёзы, чацвёрты — дзіцячую казку... Мэта гэтай працэдуры — навучыць «прастораваму бачанню», г. зн. рознабаковаму ўспрыманню прадмета. Разбіраючы і аналізуючы напісанае, будучыя журналісты вучацца адзін у аднаго ўменню назіраць, фантазіраваць, ацэньваць. Тут прысутнічае і творчае захапленне: якая цудоўная, нечаканая думка прыйшла да сакурсніка — сапраўднае маленькае адкрыццё! Навучанне ў дадзеным выпадку ідзе быццам бы падспудна — дзякуючы «гульні» новыя ісціны адкладваюцца ў падсвядомасці. Напачатку гэты, груба кажучы, добраахвотна-прымусовы метад паступова прывучае да сістэматычнага пісання. Потым студэнт уцягваецца ў творчую гульню, галоўнымі для яго становяцца цікавасць і цікаўнасць (як змагу напісаць?) — якасці прафесійныя. Значным стымулам тут выступае і элемент творчага спаборніцтва, канкурэнцыі (напісаць лепш за ўсіх).

У другіх «гульнях» напачатку студэнтам прапанавалася апісаць акраец

хлеба, беларускі рубель, матрошку, крэсла. Затым ставілася задача больш складаная — асэнсаванне абстрактнай праблемы. Напрыклад, адказаць на пытанне: «Што для журналіста важней: ведаць патроху аб усім альбо ўсё — аб нямногім?» Студэнты стараліся ўзважыць усе «за» і «супраць», рабілі аргументаваныя вывады, вырашаючы кожны для сябе гэтую дылему:

«Журналіст павінен ведаць аб усім патроху, ён жа не вучоны. Самы «бязмозгі» журналіст можа наогул нічога не ведаць, усё запісваць з чужых слоў».

«Супрацьстаўляць першую частку пытання другой нельга. Журналіст павінен мець уяўленне аб усіх сферах дзейнасці чалавека. Але абавязкова павінна быць ШТОСЬЦІ, у чым ён адчувае сябе як рыба ў вадзе. Ісціна, як звычайна, — у залатой сярэдзіне».

«Катэгарычна адказаць на пастаўленае пытанне нельга. Вы ўсё спрашчаеце. Нават у каханні катэгарычнасць умоўная, і часам «не» мае на ўвазе — «так»... Заўсёды імкнуся адыйсці ад залішняй суб'ектыўнасці, таму улічваю ўсе нюансы. Вы занадта прамалінейная — выпраўляйцеся!»

Апошні прыклад сведчыць, што прапанаваную «гульню» студэнты не ўспрымаюць як гульню: даюць парады, робяць заўвагі выкладчыку. Гэта таксама значны момант прафесійнага станаўлення — своеасаблівае справакаванае праяўленне дыялектычнага закону «адмаўленне адмаўлення». Здольнасць крытычна мысліць і не баяцца адкрыта выказваць свае думкі спрыяе адыходу ад стэрэатыпаў і штампаў, дазваляе зрабіць важны і важкі крок да фарміравання асабаснага светаўспрымання, індывідуальнага творчага патэнцыялу пачынаючых журналістаў.

На занятках нярэдка разгараюцца ажыўленыя, нават жорсткія дыскусіі аб свабодзе друку. Часам студэнты не слухаюць альтэрнатыўныя, не адпавядаючыя іх пункту гледжання меркаванні, стараюцца «перакрычаць» адзін аднаго. У такіх выпадках аўдыторыі прапануецца паразважаць на гэту тэму пісьмова. Вось тут і выяўляецца акрэсленасць і абдуманасць пазіцый:

«Свабоды друку быць не можа, ніколі і нідзе. Адзін плаціць, другі займаецца журналістыкай: другая старажытная прафесія».

«Вы хацелі свабоды слова — вы атрымалі яе? Я — атрымаў. Мне дастаткова, што я магу абмяжоўваць сябе толькі ў жорсткасці выразаў і не пераходзіць тую рысу, за якой заканчваецца разгляд праблемы і пачынаюцца газетныя звадкі».

«Многія газеты дэкларуюць «свабоду», але хай паспрабуе прынесці матэрыял у бэнээфаўскую газету камуніст — дай Бог, каб да абразы не дайшло!.. Нам неабходны газеты самых розных накірункаў: са сваіх абмежаваных кавалачкаў «свабоды» яны складаюць мазаіку па-сапраўднаму свабоднай інфармацыйнай прасторы».

Відавочна, пісьмовы варыянт мыслення значна дысцыплінуе думку, прывучае пачынаючых журналістаў да грунтоўнасці і аргументаванасці меркаванняў. Вельмі каштоўным уяўляецца і тое, што ад традыцыйнага погляду на прапанаваную праблему студэнты ўзнімаюцца да асабаснага асэнсавання ролі журналістыкі і журналіста ў сучасным грамадстве, і канкрэтна — свайго месца ў ім.

Паралельна з рашэннем чыста метадычных, тэхналагічных задач (засваеннем «рамяства») у працэсе навучання паступова выпрацоўваецца творчая, духоўная каштоўнасная арыентацыя, светапоглядныя ўстаноўкі будучых журналістаў, фарміруецца этычная пазіцыя, у якой канкрэтызуецца прафесійная пазіцыя журналіста, маральная рэгламентацыя ўсяго творчага працэсу[4]. Гэта надзвычай важна, паколькі этычная пазіцыя журналіста сумяшчае інтарэсы грамадства і спецыфічныя прафесійныя інтарэсы. Даследчык Д. Аўраамаў сцвярджае, што «аб прафесійнай годнасці чалавека да журналістыкі нельга меркаваць без уліку яго маральных якасцей, якія для гэтага віду працы маюць не меншае значэнне, чым кваліфікацыя. Прафесійнае тут практычна заўсёды выступае як маральнае, і наадварот»[5]. Аднак у наш супярэчлівы час можна весці размову і аб прыярытэце маральных пачаткаў над вузка прафесійнымі інтарэсамі. Вось некаторыя меркаванні аб гэтым студэнта Аляксандра Х.: «Свабода друку заўсёды адносная, і ў самай дэмакра-

тычнай дзяржаве друк не можа мець поўнай свабоды. І гэта абмежаванасць карысная: нават калі пераадолены ідэалагічны бар'ер, застаецца яшчэ адзін, ад ліквідацыі якога не выйграе ніхто. Гэта ўсталяваўшыяся раз і назаўсёды маральныя законы, якія пакуль яшчэ стрымліваюць чалавецтва. Іх падзенне прывядзе не толькі да свабоды друку, але і наогул да абсалютнай свабоды. Але гэта будзе больш чым пірава перамога. Я не мараліст, аднак вызваліўшы друк ад неабходнасці захоўваць грамадскія нормы, мы вызвалім яго ад сябе. Атрымаецца друк дзеля друку, адсутнасць этыкі, а ў выніку — поўны хаос і крах (не толькі друку, але і грамадства)».

У ходзе вывучэння інфармацыйных жанраў перыядычнага друку вельмі карысным аказваецца выкананне заданняў на адну і тую ж тэму: з'яўляецца магчымасць на канкрэтных прыкладах аналізаваць удалыя творчыя хады і пралікі ў пабудове матэрыялаў, лепш заўважаць знаходкі і памылкі. Параўнальнасць канчатковага выніку пры аднолькавых першапачатковых умовах дае відавочны эфект.

Пры вывучэнні тэм «справаздача» і «інтэрв'ю» звычайна наладжваюцца вучэбныя прэс-канферэнцыі. Кожны студэнт піша справаздачу аб прэс-канферэнцыі, потым падводзяцца агульныя вынікі работы над матэрыяламі, ацэньваецца якасць студэнцкіх пытанняў. Увага аўдыторыі звяртаецца на тое, што самыя каверзныя, непрыемныя пытанні журналіст павінен задаваць абавязкова ў карэктнай форме, не абражаючы субяседніка. А самае галоўнае: каб наблізіцца да ісціны, неабходна імкнуцца спасцігнуць вытокі кожнай з'явы. Толькі шляхам глыбока прадуманага падыходу да рэчаіснасці магчыма аддзяліць «зерне» ад «пустазелля», узяўшы ў спадарожнікі разважны сэнс. Эмоцыі павінны садзейнічаць пошуку ісціны, а не падмяняць яго.

Пры вывучэнні тэмы «Рэпартаж» студэнты атрымалі заданне напісаць рэпартаж з вакзала. Для збору матэрыялу ім адводзілася адна акадэмічная гадзіна. Потым сабраліся ў аўдыторыі пісаць рэпартаж. Аднак выканаць заданне студэнты не змаглі: амаль усе пайшлі па шляху найменшага супраціўлення — што бачу, тое і пішу. Кожны допіс абавязкова ўтрымліваў апісанні цыганак-гадалак, чэргаў за білетамі, цяжкіх чамаданаў. Будучыя журналісты не здолелі ўбачыць «разыначку», тэму ў тэме. У дадзеным выпадку зноў праявілася павярхоўнасць погляду: злоўлена бачная частка «айсберга», а сутнасць, соль засталіся за кадрам (вакзал — не толькі чамаданы і гадалкі). Мы свядома не акрэслілі тэму (аб'ект — складаны, заданне — досыць абстрактнае), каб паглядзець, як праявяць сябе маладыя журналісты, ці здолее кожны з іх знайсці «свой» вакзал. Аднак без прафесійнай устаноўкі тэма не знойдзена. Як аказалася, недахоп ведаў абумоўлівае і беднасць творчых сродкаў, бляклась журналісцкай палітры. «Эфект прысутнасці» —абавязковы, але недастатковы элемент рэпартажу: важную ролю адыгрывае не толькі і не столькі майстэрства прамой перадачы ўбачанага, але і ўменне за знешнім разглядзець унутранае, за прыватным —агульнае, тыповае і адметнае, знайсці цікавую дэталь, нечаканы ракурс. Менавіта гэта — прафесійнае назіранне — і адрознівае журналісцкі погляд на рэчаіснасць ад звычайнага, абывацельскага.

Са штодзённых міні-эскізаў, эцюдаў, роздумаў і іх аналізу пачынае выпрацоўвацца каштоўнае ўменне бачыць з'яву, падзею, прадмет рознабакова і рабіць аргументаваныя вывады. Паступова адточваецца думка пачынаючых журналістаў, светапоглядныя арыентацыі, прафесійнае майстэрства.

[1] Ш а п о в а л Ю. Г. Личностные методы повышения эффективности средств массовой информации. Киев, 1989. С. 19.
[2] Р о щ и н К. С. Психология и журналистика. М., 1989. С. 152—153.
[3] Ч е р е п а х о в М. С. Таинства мастерства публициста. М., 1984. С. 60.
[4] Гл.: Б у х а р ц е в Р. Вопросы профессиональной этики журналиста. Свердловск, 1971. С. 20, 42.
[5] А в р а а м о в Д. С. Профессиональная этика журналиста: парадоксы развития, поиски, перспективы. М., 1991. С. 3—4.